# XI Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні

16 красавіка 2015 г. а 10-й гадзіне ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбудзецца ўрачыстае адкрыццё XI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў «Кніжная культура Беларусі XI – пачатку XX ст.».

Кнігазнаўчыя чытанні, якія праводзяцца з 1998 года, ужо даўно сталі адным з важнейшых мерапрыемстваў, якое гуртуе даследчыкаў і спецыялістаў розных краін, што працуюць з кніжнымі помнікамі.

Сёлетняя канферэнцыя стане добрым працягам існуючай традыцыі і збярэ зацікаўленых навукоўцаў з Беларусі, Венгрыі, Канады, Літвы, Польшчы, Украіны і Расіі.

Кнігазнаўчыя чытанні аб'ядноўваюць кнігазнаўцаў, лінгвістаў, літаратуразнаўцаў, культуролагаў, гісторыкаў і філосафаў, якія прадставяць вынікі найноўшых даследаванняў па гісторыі беларускай рукапіснай і друкаванай кніжнай спадчыны XI – першай паловы XX стагоддзяў.

Значная частка дакладаў будзе прысвечана выдаўцоў і друкароў Францыска Скарыны і Марціна Кухты, мецэнатаў беларускага кнігадрукавання - Мікалая Радзівіла Чорнага, Антонія Генрыха Радзівіла і Марыі Дароты дэ Кастэлян, Супрасльскай друкарні і інш.

Канферэнцыя пройдзе ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па адрасу: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 116, канферэнц-зала (правы бакавы ўваход, 2-гі паверх).